www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 2 сакавіка 2007 года, № 4 (1955)

## ПАДЗЯКА

На імя рэктара Белдзяржуніверсітэта прафесара Васіля Стражава прыйшоў ліст ад прарэктара Пекінскага універсітэта мовазнаўства і культуры Лін Гуалі, у якім ён шчыра падзякаваў за цёплы прыём кітайскай дэлегацыі з нагоды адкрыцця Інстытута імя Канфуцыя ў БДУ.

На яго погляд, гэта падзея не толькі стане асновай для развіцця кітайскай мовы і культуры, але будзе таксама садзейнічаць далейшаму развіццю дзелавога супрацоўніцтва і навуковых даследаванняў паміж дзвюма краінамі.

Прафесар Лін Гуалі адзначыў, што Пекінскі універсітэт мовазнаўства і культуры ганарыцца партнёрствам з Беларускім дзяржаўным універсітэтам, і выказаў спадзяванне, што Інстытут імя Канфуцыя на базе БДУ стане адным з найлепшых у свеце.

**Паводле інфармацыі ўпраўлення міжнародных сувязяў**

## ПАДЗЕІ

# ВЫСТАВА АДУКАЦЫІ



Намеснік старшыні Мінгарвыканкама Міхаіл Ціцянкоў ля стэнда БДУ

Беларускі дзяржаўны універсітэт упершыню прыняў удзел на Міжнароднай спецыялізаванай выставе "Адукацыя і кар'ера", якая прайшла ў Мінскім гарадскім палацы моладзі з 22 па 24 лютага.

У сваім павільёне БДУ арганізаваў прэзентацыі ўсіх факультэтаў, вучэбных праграм і спецыяльнасцяў, а таксама продаж спецвыпуску газеты "Універсітэт" для абітурыентаў.

Выстава сабрала 66 удзельнікаў з 8-мі краін свету. Сярод іх – 8 вышэйшых, сярэдніх і спецыяльных навучальных устаноў Беларусі, міжнародныя адукацыйныя цэнтры, інфармацыйнае агенства "Інтэрфакс-Захад", выдавецтвы, каледжы і універсітэты са Швейцарыі, Вялікабрытаніі, Эстоніі, Польшчы, Чэхіі, ЗША, краін Балтыі, прадпрыемствы па вытворчасці мэблі і абсталявання.

Галоўнай мэтай гэтага маштабнага мерапрыемства было інфармаванне навучэнцаў пра ўвесь спектр сучаснай адукацыі і адпачынку, садзейнічанне ўстанаўленню дзелавых сувязяў паміж вучэбнымі установамі, вытворчымі прадпрыемствамі і навучэнцамі, паведамленне пра найбольш папулярныя прафесіі на рынку занятасці. Акрамя таго, ставілася задача ўкаранення новых адукацыйных праграм і інфармацыйных тэхналогій, а таксама паказу прадукцыі беларускіх і замежных прадпрыемстваў для аснашчэння адукацыйных устаноў.

Арганізатарамі выставы выступілі Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама і выставачнае прадпрыемства «Экспафорум». За актыўны ўдзел і добрую арганізацыю работы стэнда Беларускі дзяржаўны універсітэт атрымаў адпаведны дыплом.

**Настасся ЮДЧЫЦ**
**Фота Уладзіміра ГАЛЫНСКАГА**




Арганізатары павільёна – супрацоўнікі ГУВіНМР і прадстаўнікі факультэтаў БДУ

## УРАЧЫСТАСЦІ

# СВЯТА АБАРОНЦАЎ РАДЗІМЫ

***"Беларусь – позірк у будучыню: моц, стабільнасць, росквіт!" – пад такой назвай 23 лютага ў БДУ прайшлі святочныя мерапрыемствы, прымеркаваныя Дню абаронцаў Айчыны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.***



На пярэднім плане: рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў і старшыня Мінскага гарадскога савета ветэранаў Анатоль Адоньеў

Пачаліся яны на механіка-матэматычным факультэце з акцыі "Урок гісторыі даюць ветэраны". Пра сваё вайсковае мінулае студэнтам распавялі ўдзельнікі баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў (Эфіопія, Карэя, Афганістан).

Асноўныя ўрачыстасці прайшлі ў галоўным корпусе, дзе быў усталяваны відэаэкран, на якім трансліраваліся тэматычныя матэрыялы, а таксама разварнулася выстава літаратуры пра герояў БДУ. Перад ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, воінамі-інтэрнацыяналістамі, курсантамі ваеннага факультэта, выкладчыкамі, супрацоўнікамі і студэнтамі Белдзяржуніверсітэта выступілі рэктар прафесар Васіль Стражаў, прадстаўнікі Савета ветэранаў БДУ, Міністэрства абароны, гарадскіх грамадскіх арганізацый ветэранаў. Пасля сустрэчы адбылася цырымонія ўскладання вянкоў і кветак да памятнай стэлы загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнікам і студэнтам Белдзяржуніверсітэта. Затым быў дадзены ўрачысты прыём у рэктараце БДУ і паказана канцэртная праграма.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## СУСТРЭЧЫ

# АД КАРЭІ ДА АФГАНА…

***Сустрэча студэнтаў Белдзяржуніверсітэта з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, членамі Савета ветэранаў БДУ і Мінскага гарадскога савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў прайшла 20 лютага на фізічным факультэце.***

Перад прысутнымі выступілі старшыня Мінскага гарадскога савета ветэранаў Анатоль Адоньеў, былы камандуючы войскамі СПА генерал-лейтэнант Валерый Кастэнка, Герой Савецкага Саюза Леў Шчукін, намеснік начальніка ваеннага факультэта Ігар Заяц, а таксама намеснік старшыні Рэспубліканскай арганізацыі БГА ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў Юрый Верасаў. Гаворка ішла пра асабісты жыццёвы вопыт удзельнікаў ваенных канфліктаў у Паўночнай Карэі, Сірыі, Егіпце, В'етнаме і Афганістане і пра сучасны стан Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь.

У рамках гэтай сустрэчы быў падпісаны трохбаковы дагавор аб супрацоўніцтве паміж Саветам ветэранаў БДУ, Мінскім гарадскім саветам БГА ветэранаў баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў і пярвічнай арганізацыяй ГА "БРСМ" БДУ.

Арганізатары гэтага мерапрыемства спадзяюцца садзейнічаць такім чынам захаванню традыцый, развіццю і ўмацаванню ў студэнтаў актыўнай жыццёвай пазіцыі, патрыятызму, фарміраванню ўяўлення пра гісторыю краіны і яе герояў.

**Паводле інфармацыі ГА "БРСМ" БДУ**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**НАВУКОВЫЯ ШКОЛЫ Ў БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ**

З выступлення начальніка Галоўнага ўпраўлення навукі Тацццяны ДЗІК на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета БДУ 29 студзеня

Стар. 2

**«НЕМАСАВАЯ» МАТЭМАТЫКА**

Размова з доктарам фізіка-матэматычных навук Валянцінай КЛІМЯНОК

Стар. 4

# ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ПРАБЛЕМЫ фарміравання і развіцця навуковых школ былі абмеркаваны на мінулым тыдні ў БДУ на сустрэчы міністра адукацыі Беларусі Аляксандра Радзькова з вучонымі Белдзяржуніверсітэта. У размове прыняў удзел рэктар прафесар Васіль Стражаў.

РЭКТАР БДУ прафесар Васіль Стражаў выступіў на рэспубліканскім семінары-пасяджэнні "Інавацыйная адукацыя – стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця эканомікі Рэспублікі Беларусь", якое прайшло 26 лютага пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера нашай краіны Аляксандра Касінца.

ПАШЫРАНАЕ пасяджэнне рэктарата па пытаннях удасканальвання ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў Белдзяржуніверсітэце адбылося 26 лютага. Былі абмеркаваны план мерапрыемстваў і адпаведны загад рэктара.

УПРАЎЛЕННЕ перспектыўнага развіцця і аналітычнай работы БДУ з 1 сакавіка ўзначаліў Генадзь Дылян. Раней ён доўгі час працаваў намеснікам міністра адукацыі Беларусі.

РАДЫЁ БДУ "Юністар" з 27 лютага ўзначаліла Галіна Рэуцкая. З новым кіраўніком пазнаёміў калектыў рэктар БДУ Васіль Стражаў.

СУСТРЭЧА намесніка міністра унутраных спраў Беларусі Віктара Філістовіча са студэнтамі БДУ адбылася 22 лютага на факультэце філасофіі і сацыяльных навук. Гаворка ішла пра вынікі работы міністэрства за 2006 год, новы адміністратыўны кодэкс, а таксама пра рэформу органаў МУС. Акрамя таго, быў прадэманстраваны фільм аб прафілактыцы дарожна-транспартных здарэнняў.

ЗАГАДАМ рэктара у сувязі са святам 8 сакавіка жанчыны, якія працуюць у БДУ, атрымаюць у падарунак прэмію ў памеры 150 тыс. руб.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# НАВУКОВЫЯ ШКОЛЫ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

## З выступлення начальніка Галоўнага ўпраўлення навукі Таццяны ДЗІК 29 студзеня 2007 г. на ўрачыстым пасяджэнні Вучонага савета БДУ, прымеркаванага да Дня беларускай навукі

Пасля свайго адкрыцця 30 кастрычніка 1921 г. Беларускі дзяржаўны універсітэт хутка пераўтварыўся ў буйны навуковы цэнтр, дзе былі засяроджаны найлепшыя інтэлектуальныя сілы, прычым не толькі Беларусі. Беларускія студэнты і маладыя даследчыкі групаваліся вакол буйных вучоных, што прывяло да стварэння навуковых школ. Першую класічную школу заснаваў рэктар БДУ У.І.Пічэта, які быў выдатным гісторыкам-славістам. Яго навуковая дзейнасць звязана з даследаваннем сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі, пачынаючы з XV ст. Галоўнае, чым кіраваўся У.І.Пічэта і яго вучні, — цэласнае ўспрыманне гісторыі Беларусі, яе непарыўнасць з агульнаеўрапейскім кантэкстам, і, у першую чаргу, з усім славянскім светам. Сёння гэты напрамак узначальваюць навукоўцы гістарычнага факультэта А.Г.Каханоўскі і Ю.Л.Казакоў. Пачынаючы з 1993 г., найлепшыя вучоныя БДУ ў галіне грамадскіх навук рэгулярна ўзнагароджваюцца прэміяй Пічэты.



*Рэктар БДУ (1921–1929) прафесар Уладзімір Пічэта з калектывам у сярэдзіне 1920-х гг.*

Старэйшай навуковай школай, што была створана ў першыя дзесяцігоддзі мінулага стагоддзя і працягвае сваё існаванне на гістарычным факультэце, з'яўляецца таксама школа па гісторыі хрысціянства акадэміка АН БССР, член-карэспандэнта АН СССР, заслужанага дзеяча навукі БССР М.М.Нікольскага. У 1922 г., маючы пасаду рэктара Смаленскага універсітэта, ён быў запрошаны ў Мінск і да канца свайго жыцця працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Сёння навуковай школай па гісторыі антычнага хрысціянства кіруе доктар гістарычных навук, прафесар, лаўрэат прэміі імя Пічэты В.А.Фядосік. Найбольш істотныя дасягненні школы адлюстраваны ў 7-мі манаграфіях, якія атрымалі шырокую вядомасць і за мяжой. Акрамя таго, былі надрукаваны найважнейшыя першакрыніцы, напрыклад, першае і адзінае ў СССР выданне прац Іосіфа Флавія.

Падобныя навуковыя школы ствараліся і на іншых факультэтах БДУ. Так, на пачатку 30-х гг. на геаграфічным факультэце пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР Я.М.Афанасьева была заснавана навуковая школа па праблемах глебазнаўства і геаграфіі глеб. Яе навуковыя даследаванні спрыялі вырашэнню тагачасных агульнадзяржаўных задач. У наш час у гэтым напрамку працуюць дактары геаграфічных навук В.С.Аношка і М.К.Чартко. В.С.Аношка з'яўляецца членам Бюро Савета па фундаментальных геаграфічных праблемах Міжнароднай Асацыяцыі акадэмій навук, а таксама членам Экалагічнага савета пры камісіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, старшынёй Беларускага геаграфічнага таварыства.

Моцны штуршок развіццё беларускай навукі атрымала ў пасляваенныя гады. Менавіта тады практычна наноў пачала стварацца матэрыяльна-тэхнічная база, інтэнсіўна рыхтаваліся навуковыя кадры, вызначаліся новыя перспектыўныя напрамкі.

У той перыяд на біялагічным факультэце БДУ развіваліся навуковыя даследаванні ў прадукцыйнай гідрабіялогіі, на аснове якіх у 1947 г. узнікла навуковая школа пад кіраўніцтвам член-карэспандэнта АН СССР Г.Г.Вінберга. За час яго працы на кафедры былі падрыхтаваны 8 дактароў навук і 18 кандыдатаў, якія пачалі працаваць у іншых установах, ствараючы даччыныя школы. Сведчаннем міжнароднага прызнання стала ўшанаванне Г.Г.Вінберга медалём Міжнароднай Лімналагічнай суполкі. У 2005 г. на біялагічным факультэце быў шырока адзначаны 100-гадовы юбілей з дня нараджэння вядомага вучонага. Сёння гэты напрамак у БДУ ўзначальвае доктар біялагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі А.П.Астапеня.

Айчынныя сістэматычныя навуковыя даследаванні ў галіне вылічальнай матэматыкі пачаліся з адкрыцця ў 1957 г. кафедры вылічальнай матэматыкі. Яе заснавальнікам лічыцца акадэмік АН БССР У.І.Крылоў, які прыехаў у Мінск з Ленінграда. Кафедры адпаведных напрамкаў у БДУ доўгі час узначальвалі яго вучні – дактары фізіка-матэматычных навук, прафесары, лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі БССР У.В.Бабкоў (ФПМІ) і П.І.Манастырны (ММФ).

На фізічным факультэце ў гэты ж час закладаюцца асновы навуковай школы па тэарэтычнай фізіцы пад кіраўніцтвам доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара, акадэміка АН БССР Ф.І.Фёдарава, які заклаў фундамент для шырокіх даследаванняў па тэорыі элементарных часціц, тэорыі аптычных і акустычных уласцівасцяў крышталяў. На сёння гэты навуковы напрамак развіваецца ў працах прафесараў кафедры тэарэтычнай фізікі Л.М.Баркоўскага, І.Д.Феранчука, А.К.Гарбацэвіча, А.В.Мінкевіча, а таксама ў айчынных і замежных навуковых цэнтрах. Асноўныя навуковыя дасягненні адлюстраваны ў 8-мі манаграфіях, тры з якіх выдадзены за мяжой, 3-х патэнтах і 150-ці артыкулах у вядучых фізічных часопісах.



*Рэктар БДУ (1957–1972) прафесар Антон Сеўчанка з блізкімі вучнямі*

На юрыдычным факультэце ў 1959 г. пад кіраўніцтвам доктара юрыдычных навук, заслужанага юрыста Рэспублікі Беларусь, прафесара А.А.Галаўко была створана навуковая школа па тэарэтычных асновах дэмакратыі. Характэрна, што і сёння ва ўзросце 82-х гадоў А.А.Галаўко працягвае актыўна займацца навуковай дзейнасцю, карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод выкладчыкаў і студэнтаў, мае сотні апублікаваных навуковых прац на многіх замежных мовах. Ён падрыхтаваў больш за 50 кандыдатаў і 8 дактароў навук, удзельнічаў у падрыхтоўцы праектаў 3-х Канстытуцый, займаўся дыпламатычнай работай, быў членам Пастаяннай палаты Міжнароднага трацейскага суда ў Гаазе ад БССР, чытаў лекцыі ў многіх краінах.

У пасляваенны перыяд далейшае развіццё атрымалі калектыўныя формы арганізацыі працы, звязаныя са з'яўленнем акадэмічных і прыкладных навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый. Пачалі стварацца так званыя дысцыплінарныя навуковыя школы – даследчыя калектывы, якія займаюцца распрацоўкай новых навуковых напрамкаў. Прыкладам у БДУ з'яўляецца школа акадэміка А.Н.Сеўчанкі, які быў рэктарам універсітэта з 1957 г. па 1972 г. Яе асноўны навуковы напрамак – даследаванні ў вобласці спектраскапіі, люмінесцэнцыі і лазернай фізікі. У 1972 г. ён узначаліў створаны па яго ініцыятыве Інстытут прыкладных фізічных праблем. На сёння прадаўжальнікамі аптычнага навуковага напрамку з'яўляюцца заслужаныя дзеячы навукі Беларусі Д.С.Умрэйка, А.А.Мінько і лаўрэат Дзяржаўнай прэміі прафесар Я.С.Варапай. Прадстаўнікі школы працуюць не толькі ў БДУ, але і ў іншых ВНУ Беларусі, а таксама ва універсітэтах Германіі і Францыі. Толькі за апошнія пяць гадоў далейшыя навуковыя даследаванні знайшлі сваё адлюстраванне амаль у 300-х публікацыях, у тым ліку ў 6-ці манаграфіях і вучэбных дапаможніках. 65 распрацовак гэтай навуковай школы скарыстоўваюцца на прамысловых прадпрыемствах і ў медыцынскіх установах. На іх атрымана 42 патэнты і аўтарскія пасведчанні. Прэмія імя Сеўчанкі штогод прысуджаецца лепшым вучоным БДУ ў галіне прыродазнаўчых навук. Сёння НДІ ПФП носіць імя свайго заснавальніка, а ўзначальвае яго вось ужо амаль 30 гадоў акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук прафесар А.Ф.Чарняўскі, які стварыў уласную навуковую школу ў галіне інфарматыкі і радыёфізікі.

Найбольш інтэнсіўна новыя навуковыя школы дысцыплінарнага тыпу ствараліся ва універсітэце з 1960 г. да 1991 г. За гэты перыяд узнікла 45 навуковых школ, многія з якіх дасюль ўзначальваюць іх заснавальнікі. Яны праводзяць даследаванні ў галіне фізікі, радыёфізікі, інфарматыкі і матэматыкі, хіміі, геаграфіі і біялогіі, юрыспрудэнцыі, а таксама гуманітарнага і сацыяльнага профіляў. Безумоўна, нельга падрабязна распавесці пра кожную з іх паасобку, паколькі ўсе навуковыя калектывы маюць сваю гісторыю, традыцыі і значныя дасягненні. Узгадаем толькі тыя, якімі кіруюць член-карэспандэнты НАН Беларусі.

Так, навуковая школа фізічнай электронікі і радыяцыйнай фізікі цвёрдага цела была створана ў 1982 г. Ф.Ф.Камаровым. Дагэтуль тут падрыхтавана 9 дактароў і 32 кандыдаты навук. Вынікам яе працы з'яўляюцца 40 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтвы і патэнты, медалі ВДНГ СССР і БССР. За час існавання навуковай школы выдадзена 16 манаграфій, 5 з якіх перакладзены ў ЗША, 3 – у Польшчы. За 1982—1991 гг. былі ўкаранёныя ў вытворчасць і ў зваротную прамысловасць СССР больш за 60 распрацовак; у электронную і оптаэлектронную прамысловасць Рэспублікі Беларусь за 2000—2005 гг. – 16 распрацовак.

У 70-я гг. мінулага стагоддзя аднначасова са стварэннем кафедры біяфізікі пры фізічным факультэце пачала развівацца школа біяфізікі пад кіраўніцтвам доктара біялагічных навук, прафесара С.М.Чаранкевіча. Упершыню ў Беларусі тут пачалі падрыхтоўку адпаведных спецыялістаў. Да 2006 г. кафедрай біяфізікі былі падрыхтаваны 3 дактары і 31 кандыдат навук, апублікавана 1100 навуковых работ, атрымана 32 аўтарскіх пасведчанні і патэнты, 5 членаў школы ў 2000 г. сталі лаўрэатамі Дзяржаўнай прэміі ў вобласці навукі і тэхнікі.



*Вучні В.Свірыдава – супрацоўнікі лабараторыі хіміі тонкіх плёнак НДІ ФХП (у тым ліку сын заснавальніка школы Дзмітрый Свірыдаў, а таксама лаурэат прэміі Сеўчанкі за 2005 год Таццяна Гаеўская)*

У 60—70 гг. XX ст. на хімічным факультэце сфарміраваліся, а затым атрымалі далейшае развіццё навуковыя школы акадэмікаў НАН Беларусі В.В.Свірыдава, Ф.М.Капуцкага, А.І.Лесніковіча, член-карэспандэнтаў АН БССР І.Г.Ціхчанкі, Р.Л.Старобінца, прафесараў А.А.Вечара, Я.П.Пятраева. Напрыклад, пад кіраўніцтвам акадэміка Свірыдава па навуковым напрамку фотахіміі, хіміі цвёрдага цела і сінтэтычнай нанахіміі абараніліся 69 кандыдатаў і 7 дактароў навук, большасць з якіх працягваюць актыўна працаваць і сёння. Многія вучні В.В.Свірыдава сталі вядомымі вучонымі і кіраўнікамі буйных навуковых калектываў, маюць уласных паслядоўнікаў і фарміруюць асобныя навуковыя школы. Прызнаннем паспяховага развіцця навуковых даследаванняў на хімічным факультэце стала стварэнне ў 1977 г. НДІ фізіка-хімічных праблем. Зараз дырэктарам НДІ ФХП з'яўляецца вучань В.В.Свірыдава – член-карэспандэнт НАН Беларусі А.А.Івашкевіч.

У 1985 г. была створана навуковая школа "Матэматычнае мадэляванне складаных сістэм, працэсаў абароны інфармацыі і камп'ютарнага аналізу даных" пад кіраўніцтвам член-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Ю.С.Харына. Навуковай школай падрыхтаваны 1 доктар і 23 кандыдаты навук. Распрацаваная тут сістэма статыстычнага праграмнага забеспячэння дзейнічае ў 51-й арганізацыі Рэспублікі Беларусь і краінах СНД. Англамоўныя версіі пакетаў прыкладных праграм усталяваны ў Мюнхенскім універсітэце і Карэйскім інстытуце навуковых тэхналогій. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2000 г. на базе гэтай навуковай школы створаны Нацыянальны навукова-даследчы цэнтр прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, разгорнуты важныя для краіны работы ў галіне абароны інфармацыі.

У 1970 г. ва універсітэце была створана навуковая школа па ядзернай оптыцы, заснавальнікам якой лічыцца доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь У.Р.Барышэўскі. За час існавання школы падрыхтавана 7 дактароў і звыш 30-ці кандыдатаў навук. Выключным навуковым дасягненнем гэтай школы з'яўляюцца два навуковых адкрыцці.

Пасля распаду Савецкага Саюза на пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя і ў часы далейшага станаўлення незалежнай Беларусі навука ў нашай рэспубліцы перажывала складаны перыяд: назіраўся моцны адток кадраў з навуковай сферы, цікавасць да навукі зменшылася. Канешне, усе гэтыя працэсы закранулі і БДУ. Тым не менш, навуковая дзейнасць ва універсітэце не толькі не спынілася, але і працягвала развівацца. Больш таго, фарміраваліся новыя навуковыя школы. Характэрным для гэтага часу з'яўляецца стварэнне большасці навуковых школ у галіне гуманітарных навук.

У апошнія гады погляды на ролю навукі змяніліся. Зараз ад яе чакаюць не толькі атрымання вынікаў, здольных пашырыць веды, але, у першую чаргу, узмацнення ўплыву на навукова-тэхнічны прагрэс нашай краіны. На гэтым этапе з'явілася новая форма арганізацыі навукі, якая будуецца паводле праблемнага прынцыпу. Пачынаюць стварацца вялікія і малыя творчыя калектывы для рашэння тых ці іншых навуковых праблем на міждысцыплінарнай, а часта і на міжгаліновай аснове. Паводле характару сваіх функцый і магчымасцяў такія калектывы ўяўляюць сабой новы тып навуковых школ. Так, у НДІ ФХП пры непасрэдным удзеле акадэміка Ф.М.Капуцкага адкрыта "Лабараторыя лекавых сродкаў на аснове мадыфікаваных поліцукрыдаў" і створаны новы навуковы напрамак па распрацоўцы лекавых прэпаратаў. Зараз у лабараторыі працуюць не толькі хімікі, але і 4 супрацоўнікі з медыцынскай адукацыяй.

Напрыканцы хацелася б звярнуцца да нашых студэнтаў. Сёння ў вас ёсць унікальная магчымасць далучыцца да дзейнасці значных навуковых школ, каб у сумеснай працы з прызнанымі вучонымі нашага універсітэта набыць неацэнны вопыт, рэалізаваць свой творчы і інтэлектуальны патэнцыял і знайсці чыннае месца ў жыцці.

УНІВЕРСІТЭТ

ШУКАЕМ ТАЛЕНТЫ

# ЮНЫЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЫ



На базе факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі ў галоўным корпусе БДУ зараз праходзіць XXVIII Міжнародны матэматычны турнір гарадоў (сярод школьнікаў 6–11 класаў Мінска). Ён праводзіцца сумесна з Камітэтам па адукацыі Мінгарвыканкама. Усяго прымаюць удзел больш за 600 чалавек. 25 лютага 2007 года ўжо адбыўся трэці тур. Наперадзе — чацвёрты, які пройдзе 4 сакавіка.

Першыя ж два туры прайшлі ў БДУ 22 і 29 кастрычніка 2006 года. У іх удзельнічалі адпаведна 925 і 694 школьнікі. Паводле правілаў спаборніцтваў канчатковыя вынікі будуць падведзены пасля кантрольнай праверкі Цэнтральным журы (летам ці ў верасні), якое працуе на базе Маскоўскага цэнтра бесперапыннай матэматычнай адукацыі. Дарэчы, аналагічныя спаборніцтвы праходзяць адначасова больш чым у 100 гарадах свету.

Турнір гарадоў – міжнародная алімпіяда па матэматыцы для школьнікаў. Ён праводзіцца з 1980 года і мае два варыянты: асноўны і трэніровачны. У першы ўключаюцца задачы, якія па складанасці супастаўляюцца з задачамі Усерасійскай і Міжнароднай матэматычных алімпіяд і разлічаны на вучняў 8–11 класаў. Другі варыянт прасцей.

Турнір гарадоў дэмакратычны паводле сваіх прынцыпаў. У ім можа ўдзельнічаць кожны школьнік. Спаборніцтвы складаюцца з чатырох раўназначных тураў. Удзельнічаць дастаткова толькі ў адным з іх – вынік вызначаецца па лепшай выкананай рабоце, якая ўключае тры задачы. Таму няма неабходнасці рашаць як мага болей задач, галоўнае – рашаць лепей.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

# КАНФЕРЭНЦЫЯ «АДОРАНЫХ»

***Міністэрства адукацыі Беларусі і Беларускі дзяржаўны універсітэт правялі 23–25 лютага на базе Мінскага абласнога ліцэя XI Рэспубліканскую канферэнцыю навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў.***

На адкрыцці выступілі сустаршыні аргкамітэта канферэнцыі намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір Фарына і прарэктар БДУ дэкан факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Павел Мандрык. Прысутнічалі таксама прадстаўнікі ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама. Мэтай гэтага штогадовага мерапрыемства з'яўляецца выяўленне адораных школьнікаў – будучай навуковай эліты краіны. Арганізатары канферэнцыі надаюць ёй галоўную ўвагу ў навуковадаследчай рабоце таленавітых падлеткаў.

На папярэднім этапе журы адабрала 162 работы з ліку 300, што паступілі з усіх абласцей Беларусі. Школьнікі абаранялі іх перад сваімі равеснікамі і прадстаўнікамі журы (дастаткова заўважыць, што ў яго склад уваходзілі 8 дактароў і 29 кандыдатаў навук) у рамках секцый астраноміі (18 дакладаў), біялогіі (28), інфарматыкі (31), матэматыкі (30), фізікі (26), хіміі (29).

Лепшыя работы адзначаны дыпломамі Міністэрства адукацыі Беларусі і будуць прадстаўлены на міжнародных канферэнцыях школьнікаў у Расіі, Іспаніі і ЗША. Дарэчы, у мінулым годзе са 135-ці дакладаў 45 заслужылі дыпломы рознай ступені.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

ЮБІЛЕІ

# Рэдкі Чалавек



Зусім нядаўна, 23 лютага, у чытальнай зале факультэта журналістыкі адбылася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная 85-годдзю заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь, доктара філалагічных навук, прафесара Міхася Яўгенавіча Цікоцкага. Канферэнцыя насіла назву "Жыццём і словам прысягаючы...". Сапраўды, Міхась Яўгенавіч прысвяціў усё сваё жыццё справе, якая патрабуе не толькі інтэлектуальнай працы, але і неверагодных душэўных намаганняў. Ён – адзіны прафесар у рэспубліцы, які ўжо 50 гадоў даследуе стылістыку беларускай мовы. Акрамя гэтага, ён працуе выкладчыкам на факультэце журналістыкі БДУ, які скончыў у 1950 г. М.Цікоцкі з'яўляецца вядомым даследчыкам гісторыі беларускай журналістыкі, займаецца публіцыстыкай.

Павіншаваць юбіляра прыехалі шматлікія калегі з Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Азербайджанскага універсітэта моў, Бакінскага славянскага універсітэта, Сібірскага федэральнага універсітэта і інш.

Словы падзякі, цікавыя даклады... І ўсё ў гонар аднаго чалавека, пра якога кандыдат філалагічных навук Марыя Карповіч сказала так: "Магутны Божа! Не прыспешвай наш век: нам нячаста трапляе такі чалавек".

**Лейла ІСМАІЛАВА**

АКЦЫІ

# ЗА КАХАННЕМ – У БДУ

Святочная акцыя, прымеркаваная да Дня святога Валянціна, прайшла 14 лютага ў галоўным корпусе Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Яе арганізатарамі выступілі студэнцкі саюз, камітэт БРСМ, савет старастаў, студэнцкі савет па якасці адукацыі.

Мэтай акцыі стаў пошук новых форм арганізацыі вольнага часу і стасункаў паміж студэнтамі, далучэнне моладзі да грамадскага жыцця БДУ. Падчас мерапрыемства былі праведзены псіхалагічныя гульні пад назвай "Гаворка па крузе", "Пяціхвілінныя спатканні", конкурсная праграма для пар, а таксама выбар "Валянціны" і "Валянціна" 2007 года. Асобую цікавасць у наведвальнікаў выклікала галасаванне паводле электроннай прэзентацыі прызнання ў каханні.

Свята ўсіх закаханых дагэтуль насіла ў БДУ разрозненыя характар. Згаданы праект, на думку арганізатараў, заклікана змяніць існае становішча і распачаць новую традыцыю, якая дапаможа ў вырашэнні міжасабовых пытанняў, што ўзнікаюць перад студэнтамі, аб'яднае маладзёжныя арганізацыі універсітэта для сумеснай работы, а таксама будзе садзейнічаць павышэнню цікавасці да агульнауніверсітэцкіх мерапрыемстваў.

**Дар'я ПРЫШЧЭПАВА**




**Інтэрв'ю з кандыдатам фізіка-матэматычных навук, дацэнтам БДУ, аўтарам школьных вучэбна-метадычных комплексаў і падручнікаў Ларысай Ісачанкавай** – "Настаўніцкая газета" (24.02).

**Свята да Дня абаронцаў Айчыны ў ліцэі БДУ** – "Рэспубліка" (23.02).

**Сустрэча міністра адукацыі Аляксандра Радзькова з вучонымі, кіраўнікамі навуковых школ БДУ** – "Настаўніцкая газета" (24.02).

**Адзінаццатая рэспубліканская канферэнцыя навучэнцаў агульнаадукацыйных устаноў, якую правялі БДУ і Мінадукацыі РБ** – "Звязда" (23.02).

**Дырэктар Цэнтра інфармацыйных тэхналогій Юрый Ватрціцкі ўспамінае сваю кінаролю ў мастацкім фільме "Расклад на паслязаўтра"** – "Беларусь сегодня" (22.02).

**Каманда Ліцэя БДУ атрымала 1 залаты і 2 сярэбраных медалі на міжнароднай алімпіядзе па фізіцы ў Алматы** – "Minsk Times» (22.02), "Минский курьер" (15.2).

**Навучанне кітайскіх студэнтаў у БДУ** – "Minsk Times» (22.02).

**Сістэма дыстанцыйнага навучання ў Беларусі, у тым ліку і ў БДУ** – "Настаўніцкая газета" (20.02).

**85-годдзе доктара філалагічных навук прафесара Міхаіла Цікоцкага** – "Звязда" (20.02), "Настаўніцкая газета" (20.02).

**Сустрэча студэнтаў БДУ з ветэранамі ВАВ і Мінскага гарадскога савета Беларускага аб'яднання ветэранаў баявых дзеянняў** – "Рэспубліка" (20.02).

**30-я міжнародная выстава "Каменная казка"** – «Минский курьер» (20.02).

**Святкаванне Дня святога Валянціна ў БДУ** – "Рэспубліка" (15.02).

**Круглы стол у газеце "Беларусь сегодня", прысвечаны праблемам журналістыкі, у якім прыняў удзел дэкан журфака БДУ Сяргей Дубовік** – "Беларусь сегодня" (15.02).

**Другі з'езд студэнцкіх і маладзёжных арганізацый ВНУ краін СНД, які быў арганізаваны БДУ і на яго базе** – "Народная газета» (15.02).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

З 11 па 16 лютага ў г. Обнінск Калужскай вобласці (Расія) праходзіў II Міжнародны Стрэчанскі праваслаўны кінафестываль "Сустрэча". На яго было прыслана 280 кінастужак, з якіх для ўдзелу ў конкурсе адабралі 75: 10 мастацкіх, 45 дакументальных і 20 анімацыйных карцін кінематографаў Расіі, Беларусі, Грузіі, Сербіі, Чарнагорыі, Босніі і Герцагавіны. Прысланыя работы ацэньвала журы ў складзе дванаццаці чалавек пад старшынствам народнага артыста Расіі, прэзідэнта кінафестывалю "Залаты віцязь" Мікалая Бурляева. Фільм "Паэма веры" студэнцкай відэастудыі "SVS" (аўтары А.Куціла і А.Налівайка) ганараваны спецыяльным дыпломам і прэміяй "За дэбют".

***

Акцыя "Жыццё без тытуню" была праведзена 20 лютага 2007 г. у інтэрнаце № 5. У рамках яе адбылася сустрэча з прадстаўнікамі цэнтра "Абароны жыцця дзяцей", конкурс насценных газет, вершаў і песень на антытытунёвую тэматыку.

***

20 лютага было праведзена пасяджэнне літаратурна-музычнай гасцёўні "Натхненне", прымеркаванае да Дня абаронцы Айчыны. Усе, хто прыйшоў акунуцца ў святло музыкі і паэзіі, маглі пачуць успаміны намесніка ваеннага факультэта палкоўніка Мікалая Сурмача пра вайну ў Афганістане, літаратурна-музычную кампазіцыю "Афганская зоркі", новыя вершы і песні студэнтаў.

***

22 лютага ў інтэрнаце № 6 адбылася сустрэча навучэнцаў юрыдычнага каледжа з намеснікам старшыні камісіі па справах непаўналетніх Адміністрацыі Ленінскага раёна г. Мінска Інесы Кіслай і начальнікам інспекцыі па справах непаўналетніх Вольгі Сакаловай. Падчас размовы абмяркоўваліся пытанні папярэджання правапарушэнняў сярод непаўналетніх, правілы паводзін у грамадскіх месцах.

**Паводле інфармацыі Студгарадка**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# Пасылка з СНД

***На сустрэчы з удзельнікамі II З'езда студэнцкіх і маладзёжных арганізацый ВНУ краін СНД, які праходзіў у Мінску з 28 студзеня па 2 лютага, старшыня Выканкама СНД Уладзімір Рушайла перадаў БДУ 2500 кніг новай навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры (агульным коштам каля 15 тыс. долараў).***

Гэтая дабрачынная акцыя адбылася ў рамках праграмы Фонда падтрымкі эканамічнага развіцця краін СНД на чале з дырэктарам Міхаілам Сазонавым. Яна скіравана на камплектаванне фондаў вядучых бібліятэк краін СНД рускамоўнай літаратурай. Надалей таксама плануецца перадача БДУ значнай колькасці вучэбнай літаратуры.

**Паводле інфармацыі Фундаментальнай бібліятэкі БДУ**

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

У Беларускім дзяржаўным універсітэце 27 і 28 лютага прайшла Трэцяя міжнародная навуковая канферэнцыя "Актуальныя праблемы сучаснай амерыканістыкі (культуралагічны аспект)", арганізатарам якой выступіў факультэт міжнародных адносін. У яе адкрыцці прынялі ўдзел рэктар БДУ прафесар Васіль Стражаў, прадстаўнікі Міністэрства культуры нашай краіны, а таксама пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь.

Канферэнцыя сабрала каля ста навукоўцаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы і ЗША. Яны абмеркавалі пытанні амерыканскай культуры, філасофіі і паліталогіі. Акрамя пленарных пасяджэнняў працавалі секцыі "Літаратура ЗША XIX стагоддзя", "Літаратура ЗША XX стагоддзя", "Філасофія, гісторыя, камунікатыўныя тэхналогіі", "Кампаратывістыка", а таксама студэнцкая секцыя.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Ширяев И.А., Ахмеров Э.К.* **Волейбол.** У вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь даецца характарыстыка тэхнікі і тактыкі валейбола як састаўных частак прадмета спартыўнага ўдасканалення студэнтаў.

**Инфекционные болезни.** У вучэбным дапаможніку выкладаюцца асновы этыялогіі, эпідэміялогіі, клінікі і прафілактыкі інфекцыйных захворванняў.

*Егоров А.А.* **Вычислительные алгоритмы линейной алгебры.** У вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разглядаюцца асноўныя раздзелы вылічальных метадаў рашэння задач лінейнай алгебры.

**Актуальные проблемы современного белорусского общества: социологический аспект.** У кнізе




прадстаўлены вынікі шэрагу сацыялагічных даследаванняў, праведзеных аўтарамі ў 1994–2004 гг., даецца сістэматызаванае ўяўленне пра сутнасць, спецыфіку і дынаміку асноўных трансфармацыйных і дыфузных працэсаў у беларускім грамадстве.

**Современный русский язык. В 3 частях. Часть 2.** У хрэстаматыі змешчаны артыкулы і вытрымкі з прац вядомых русістаў па ўсіх раздзелах курса сучаснай рускай мовы.

**Применение молекулярной люминесценции и спектроскопии к исследованию структуры и свойств вещества.** У манаграфіі змешчана інфармацыя пра метады і вынікі вызначэння структурнай арганізацыі і ўласцівасцяў комплексаў цяжкіх металаў, газанапоўненых палімераў, палімецінавых фарбавальнікаў, біясубстратаў, вадкіх крышталяў.

*Хомич С.А.* **Стратегический менеджмент.** Курс лекцый уключае




характарыстыку асноўных элементаў сістэмы стратэгічнага менеджменту, навукова-метадычныя прыёмы распрацоўкі стратэгій карпаратыўнага ўзроўню.

**Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу.** Аснову зборніка складаюць тэксты мастацкага стылю, дзе ўсе лінгвістычныя элементы сплецены ў адзіную вобразную сістэму.

*Духан И.* **Теория искусств: Категория времени в изобразительном искусстве и архитектуре.** У вучэбным дапаможніку з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь аналізуецца сувязь мастацкага часу і філасофіі часу, разглядаецца тыпалогія часавых стратэгій у мастацтве і архітэктуры.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

## АСОБЫ

# «НЕМАСАВАЯ» МАТЭМАТЫКА

**Напярэдадні Дня жанчын мы пагаварылі з Валянцінай КЛІМЯНОК, адной з дзвюх жанчын-матэматыкаў у БДУ, якія маюць ступень доктара навук. Зараз яна працуе галоўным навуковым супрацоўнікам навукова-даследчай лабараторыі прыкладнога імавернаснага аналізу БДУ, а таксама выкладчыкам на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Валянціна Іванаўна не толькі пастаянна прымае ўдзел у прэстыжных міжнародных навуковых канферэнцыях і друкуе свае артыкулы ў вядучых сусветных навуковых часопісах, такіх як Queueing systems, Performance Evaluation, European Journal of Operational Research і інш., але нават стварыла тэарэму, што заслужыла прызнанне калег з іншых краін і была названа ў гонар вынаходцы.**



**– Як Вы прыйшлі ў навуку?**

– Цікавасць да матэматыкі ў мяне праявілася яшчэ падчас вучобы ў школе. З паступленнем у БДУ я атрымала магчымасць усе свае сілы і час прысвячаць вывучэнню любімай дысцыпліны. Скончыла факультэт прыкладной матэматыкі з дыпломам з адзнакай і была накіравана на работу ў навукова-даследчую лабараторыю пры кафедры тэорыі імавернасці і матэматычнай статыстыцы ФПМІ, дзе і працую ўжо больш за 30 гадоў.

**– Раскажыце пра Вашы навуковыя інтарэсы.**

– У лабараторыі я пачала займацца тэорыяй масавага абслугоўвання, якая вельмі моцна захапіла мяне і стала асноўным напрамкам прафесійнай дзейнасці. Яна прадугледжвае вывучэнне выпадковых працэсаў, якія працякаюць у розных рэальных сістэмах, дзе могуць утварацца чэргі на абслугоўванне. Асабліва важнай вобласцю прымянення тэорыі масавага абслугоўвання з'яўляюцца тэлекамунікацыйныя сеткі. З дапамогай матэматычных метадаў сёння можна палепшыць якасць абслугоўвання, эфектыўнасць функцыянавання мабільнай сувязі, інтэрнета, лакальных сетак. Мае даследаванні тычацца ўсіх гэтых аспектаў. Як бачыце, гэта тэорыя закранае розныя сферы грамадскага жыцця і можа лёгка знайсці прымяненне на практыцы.

**– Што для Вас значыць навуковая дзейнасць?**

– Матэматыка для мяне – і хобі і прафесія адначасова. Насамрэч, гэта навука мае творчы характар. Ён праяўляецца, напрыклад, падчас аналізу выпадковых сітуацый, стварэння розных матэматычных мадэлей. Але, каб дасягнуць поспеху ў гэтым напрамку, акрамя творчага імпэту, трэба мець абстрактнае мысленне і добрае ўяўленне.

**– Як Вы ставіцеся да таго, што з'яўляецеся адной з пяці жанчын-матэматыкаў у нашай краіне, якія маюць ступень доктара навук?**

– Шчыра кажучы, я ніколі не ставіла перад сабой мэту ў любым выпадку абараніць доктарскую дысертацыю. Проста працавала для сабе, займалася ўлюбёнай справай. А на пэўным этапе жыцця, урэшце, адчула неабходнасць падвесці вынікі, сістэматызаваць навуковыя здабыткі.

**– Акрамя працы ў лабараторыі Вы знаходзіце час і для педагагічнай работы. Як ацэньваеце ўзровень падрыхтаванасці цяперашніх студэнтаў ФПМІ?**

– Моладзь, якая паступае на наш факультэт, досыць падрыхтаваная. Нават студэнты малодшых курсаў разумеюць, што калі яны самі сабе не дапамогуць, наўрад ці ім дапаможа хто-небудзь іншы. Большасць з іх – актыўныя і старанныя маладыя людзі. На жаль, на апошніх курсах многія студэнты ўладкоўваюцца на працу і менш увагі надаюць вучэбнаму працэсу. Але заўсёды ёсць і тыя, хто прысвячае матэматыцы не толькі ўвесь свой час, але і цэлае жыццё.

**– Якой Вы бачыце сваю далейшую прафесійную дзейнасць?**

– Я маю намер як мага даўжэй займацца матэматыкай, перадаваць свае веды студэнтам. А яшчэ спадзяюся, што ў будучыні тэорыя масавага абслугоўвання стане не менш папулярнай і запатрабаванай у нашай краіне, чым на Захадзе.

**– Што б Вы пажадалі дзяўчынам, якія вырашылі звязаць свой лёс з матэматыкай?**

– Вельмі хочацца, каб матэматыка не была для іх цяжарам, а прыносіла радасць. І каб навука не засланяла ўсё ў жыцці.

**Гутарыла Надзея КЛЕМЯНЦЁНАК**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## ВЫСТАВЫ

# «КАЗАЧНЫЯ» ЦУДЫ

***У галоўным корпусе БДУ прайшла 30-я мінералагічная выстава-кірмаш "Каменная казка", прысвечаная Дню жанчын. Падвесці вынікі шматгадовай працы і распавесці пра адметнасці юбілейнай выставы, а таксама пра далейшыя планы мы папрасілі галоўнага арганізатара, загадчыцу Музея землязнаўства геаграфічнага факультэта Валянціну Смалякову:***



– У 1990 годзе Музей землязнаўства правёў першую ў гісторыі Беларусі Міжнародную мінералагічную выставу, якая і распачала серыю "Каменная казка". Мы выхавалі цэлую плеяду майстроў (дзякуючы супрацоўніцтву з намі многія з іх атрымалі званне заслужаных дзеячаў мастацтва краіны), з кожным годам пашыраецца кола тых, хто цікавіцца чароўным светам камянёў. Заўжды рыхтуем штосьці незвычайнае, новае, каб здзівіць нашых наведвальнікаў. Гэтым разам такіх "цвікоў праграмы" было адначасова некалькі. Па-першае, "Сімвалы мезазойскіх мораў" - выстава рэдкіх мінералаў, якія музей збіраў на працягу 30-ці гадоў. Па-другое, "Старонка мінулага ў бурштыне" – экспазіцыя бурштыну з інклюзамі, захаванымі ў акамянелай смале насякомымі, бактэрыямі, пузыркамі паветра ці вадкасці дагістарычных часоў.

Асабліва месца занялі на кірмашы работы майстроў грамадскага аб'яднання супрацоўніцтва дзелавых і творчых жанчын. З розных непрыдатных, малапатрэбных матэрыялаў – гузікаў, старых караляў – нашы жанчыны робяць сапраўдныя цуды!

Наступную "Казку" мяркуем прысвяціць палярным даследаванням (гэты год абвешчаны ЮНЭСКА годам палярніка), пакажам калекцыю мінералаў, падараваных геолагам Верай Грэсь, якая 30 гадоў працавала на Поўначы.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

## ГОСЦІ

# ЖАНОЧАЯ ДЫПЛАМАТЫЯ

Удзельніцы клуба жонак паслоў і дыпламатаў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, 20 лютага наведалі з экскурсіяй кабінет-музей беларускай народнай культуры філалагічнага факультэта БДУ. Гэта мерапрыемства арганізавана Саюзам жанчын БДУ, які мае з клубам шматгадовыя стасункі.

Гасцямі філфака сталі больш за 30 прадстаўніц розных краін. Яны пазнаёміліся з пастаяннымі экспазіцыямі музея: "Хата беларуская", "Праваслаўныя абразы Божай Маці на Беларусі" і "Эвалюцыя вясельнага каравая". Жонкі паслоў убачылі таксама ўнікальную работу "Зямля на ўсіх адна", выкананую ў тэхніцы "фрывалітэ", беларускія нецкэ, калекцыю даматканых ручнікоў з усіх куткоў беларускай зямлі і нядаўна адкрытую выставу дзіцячага жывапісу.

**Марыя АКУЛІК**

## АПЫТАННЕ

# Што паляпшае Вам настрой?

***Напярэдадні 8 сакавіка рэдакцыя газеты звярнулася да некалькіх вядомых у БДУ жанчын, якія займаюць кіруючыя пасады, з мэтай высветліць, што заўсёды паляпшае ім настрой, і атрымала наступныя адказы:***

**Старшыня Саюза жанчын БДУ Святлана Савіна:**

– Вельмі добра паляпшае мне настрой удала праведзеная нашай арганізацыяй акцыя. Іх мы ладзім даволі многа і кожны раз атрымоўваем безліч станоўчых эмоцый. Таксама люблю падарожжы і зусім не абавязкова за мяжу. Вялікую асалоду атрымліваю проста ад паездкі за горад, сустрэчы з прыродай. Ну і, канешне, кветкі...

**Начальнік ГУПБУіФ Валянціна Саладуха:**

– Мне становіцца добра, калі на рахунку БДУ з'яўляецца шмат грошаў *(смяецца)*. Не магу не адзначыць свой дружны калектыў, вельмі кампетэнтны і надзейны. З такімі людзьмі хочацца сустракацца, рабіць адну справу. Што ў жыцці – апошнім часам прыкіпела да дачы. Не магу не нарадавацца на свайго 11-гадовага ўнука. З ім і мужам нават езджу на рыбалку. Сама, вядома, не лаўлю, але надта цікава назіраць за іх дзеяннямі.

**Начальнік ГУВіНМР Людміла Хухлындзіна:**

– Люблю многа сонца. Таксама усмешкі вакол сябе. Прыемна паразмаўляць проста з добрымі людзьмі (прычым рознага ўзросту). Радуюся, таксама, добра праведзенай лекцыі, бо яна дазваляе нават трошкі паакцёрстваваць. А вось што не вельмі ўдаецца, то гэта рабіць сюрпрызы, бо ніколі не магу дачакацца патрэбнага моманту і заўсёды заўчасна расказваю пра прыгатаваны сакрэт.

**Начальнік Галоўнага ўпраўлення навукі Таццяна Дзік:**

– Вялікае задавальненне атрымліваю ад добрых вынікаў сваёй работы. Але з-за яе амаль не маю вольнага часу. Адпачынак для душы знаходжу ў гутарцы з блізкімі людзьмі. Дапамагаюць скінуць залішняе напружанне таксама дзеці, асабліва іх поспехі ў школе.

**Старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніна Радзевіч:**

– Прыемна бачыць ля сябе сапраўднага мужчыну, які гатовы падарыць букет і можа сказаць цёплыя словы. Прыемна сустракаць людзей з усмешкай, гэта робіць усіх сімпатычнымі. Люблю свой дом, з задавальненнем ствараю сямейную ўтульнасць. На рабоце шмат станоўчай энергіі атрымліваю ад спраўнай дзейнасці маіх падапечных.

**Начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай дзейнасці Ірына Лук'янчык:**

– Самыя ўзнёслыя пачуцці ўзнікаюць пасля ўдалай работы. Кожную новую кніжку мы з нецярпеннем чакаем і з цікавасцю разглядаем, бо ўсе яны маюць свае адметнасці. Значны імпульс прыдае прызнанне сваёй працы і працы калектыву. Гэта заўсёды спрыяе ўзнікненню новых ідэяў, творчых памкненняў. Само знаходжанне ў нашым дружным асяродку спрыяе майму добраму настрою, асабліва калі ўсе супрацоўнікі здаровыя.

**Начальнік упраўлення прававой работы Алена Швакава:**

– Найбольш мне даспадобы ўвага мужчын *(смяецца)*. Вельмі падабаюцца розныя смешныя сітуацыі. Калі яны самі не адбываюцца, то прыходзіцца іх самой мадэляваць *(смяецца)*. Але асаблівае задавальненне я атрымліваю ад стасункаў са сваімі дзецьмі. Вельмі ўсцешвае, калі яны спрабуюць праяўляць сваю дарослаць, штосьці сцвярджаць ці паказваць.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

2 сакавіка 2007 года.
Падпісана да друку 1.03.2007 г.
Зак. 153. Тыраж 1500 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6.

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by